Асабліва спадар Севярын падкрэсліў неабходнасць правядзення дыялогу паміж уладамі і апазіцыяй для "дасягнення кансенсусу на юрыдычнай аснове для свабодных і справядлівых парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў".

Слуханні ў Бухарэсце, як і цяперашні візіт спадара Севярына ў Мінск (ужо трэці па ліку), з'яўляюцца складаючымі часткамі падрыхтоўкі да намечанага на ліпень пасяджэння сесіі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Прадстаўнікі аб'яднання беларусаў Вялікабрытаніі правялі пікетаванне Пасольства Беларусі ў Лондане

Як паведамілі БелаПАН у прэс-цэнтры Хартыі'97, у дзень правядзення выбараў прэзідэнта Беларусі, аб'яўленых Вярхоўным Саветам Беларусі 13-га склікання, прадстаўнікі аб'яднання беларусаў Вялікабрытаніі правялі пікетаванне беларускага пасольства ў Лондане. Акцыя была арганізавана пасля таго, як супрацоўнікі пасольства адмовілі грамадзянам Беларусі, якія жывуць у Вялікабрытаніі, узяць удзел у выбарах, спаслаўшыся на тое, што на гэты конт ад Міністэрства замежных спраў не атрымана ніякіх інструкцый. У пікетаванні ўзялі ўдзел каля 30 чалавек. Яны трымалі ў руках бел-чырвона-белыя сцягі і плакаты з лозунгамі пратэсту супраць парушэння правоў чалавека ў Беларусі, палітыкі русіфікацыі, а таксама падтрымкі беларускімі ўладамі рэжыму Мілошавіча. Прахожым раздаваліся інфармацыйныя ўлёткі, якія датычыліся прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.

Наталля КУЛАГІНА.

17-гадовы беларус Аляксандр Дзянісюк стаў лаўрэатам усеўкраінскага конкурсу кларнетыстаў

Паспяхова выступіў на ўсеўкраінскім конкурсе кларнетыстаў "Сельмер — Парыж ва Украіне" вучань 11-га класа каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі (клас дацэнта Івана Брычыкава) Аляксандр Дзянісюк. Ён стаў лаўрэатам трэцяй прэміі ў сярэдняй групе канкурсантаў (да 17 гадоў).

Паводле слоў педагога маладога музыканта, конкурсная праграма Аляксандра была дастаткова складанай. Ён выконваў вялікі канцэртны дуэт Вэбера для фартэпіяна і кларнета, канцэрціну Вэбера і шэраг іншых. Канкурсант здолеў праявіць свае лепшыя выканальніцкія якасці — майстэрскае валоданне гукам, тонкую музыкальнасць.

З творчай паездкі ў Парыж вярнуліся педагогі і навучэнцы каледжа пры Бларускай акадэміі музыкі

Група педагогаў і навучэнцаў каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі вярнулася з Францыі. Паездка ажыццяўлялася ў межах пагаднення аб творчым супрацоўніцтве паміж беларускімі і французскімі музыкантамі.

У складзе дэлегацыі былі дырэктар музычнага каледжа Уладзімір Кузменка, загадчык струнным аддзяленнем Лілія Умнова, камерны аркестр пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Беларусі Уладзіміра Перліна, а таксама таленавітыя маладыя выканаўцы Алег Яцына, Уладзімір Сянкевіч, Андрэй Шынкевіч і іншыя. Яны саліравалі на канцэртах, што прайшлі ў Парыжы, бралі ўдзел у працы майстар-класаў.

Пагадненне паміж музыкантамі і педагогамі дзвюх краін прадугледжвае ўзаемную вучобу, абмен вопытам падрыхтоўкі маладых выканаўцаў. У сакавіку бягучага года ў Мінску пабывалі педагогі і навучэнцы муніцыпальнай кансерваторыі 18-й акругі Парыжа. Тады мінчане мелі магчымасць пазнаёміцца з майстэрствам піяніста Жэрома Дзюкло, віяланчэліста Жэрома Пярно, скрыпача Аніка Русена і іншых музыкантаў.

Вера КРОЗ.

"Беларускі кірмаш" у Цюмені

У Цюмені (Расійская Федэрацыя) адбылася выстава прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь "Беларускі кірмаш", арганізаваная Міністэрствам замежных спраў Беларусі і выставачным таварыствам "Белавежскі кірмаш" (Мінск) сумесна з ААТ "Тюменская международная ярмарка". У выставе прынялі ўдзел 23 беларускіх прадпрыемствы, у тым ліку "Палессеэлектрамаш" з Лунінца, ААТ "Фандок" з Бабруйска, "Канстанта" з Барысава, "Ювелір" з Гомеля, Мінскі авіярамонтны завод, трыкатажная фабрыка з Баранавічаў і шэраг іншых. Выстава заклікана садзейнічаць умацаванню гандлёва-эканамічных адносінаў паміж Беларуссю і Цюменскай вобласцю.

Хутка паляцім у Будапешт

Як паведамілі ў Дзяржаўным камітэце па авіяцыі Беларусі, на мінулым тыдні ў Мінску па ініцыятыве венгерскага боку адбыліся папярэднія перамовы з кіраўніцтвам авіякампаніі "Малеў" (Венгрыя) аб арганізацыі рэгулярнага рэйсу паміж Будапештам і Мінскам. Прадстаўнікі Венгрыі засталіся задаволены ўмовамі арганізацыі перавозак, прапанаванымі беларускімі авіяцыйнымі ўладамі. Перамовы па пытанні адкрыцця новай паветранай лініі будуць працягнуты.

Ірына САЗАНОВІЧ.

У Мінск прыбыла гуманітарная дапамога для насельніцтва пацярпеўшых ад паводкі раёнаў Палесся, сабраная беларусамі Беластоцкага краю Польшчы

У Мінск, у храм Міласэрнасці, які будуецца пры Беларускім экзархаце, паступіла дапамога для насельніцтва пацярпеўшых ад веснавой паводкі раёнаў Палесся, сабраная па ініцыятыве беларусаў Беластоцкага краю Польшчы.

Усе расходы па перавозцы 28-тоннага фургона і закупцы гаручага ўзяў на сябе польскі бок. Як паведаміла адзін з арганізатараў акцыі Ірэна Трашчотка, член Беларускага праваслаўнага брацтва святога Мікалая, дапамога, сабраная праваслаўнымі беларусамі Беласточчыны, складаецца з адзення, абутку, прадметаў бытавога ўжытку і прадуктаў харчавання на дзесяткі тысяч злотых. Збор дапамогі праходзіў у цэрквах Беластока, вёсках, а таксама ў школе N3 Бялай Падляскі з беларускай мовай навучання.

І.Трашчотка выказала падзяку беларускаму консулу ў Беластоку Мікалаю Крэчку за садзейнічанне ў гэтай акцыі, якое значна спрасціла ўсе фармальнасці пры перасячэнні мяжы з абодвух бакоў.

Паводле слоў І.Трашчоткі, аўтафургон, які прыбыў, можна назваць "першай ластаўкай". Большасць насельніцтва Польшчы, адзначыла яна, аб беларускай паводцы нічога не ведала. Дарэчы, падобныя гуманітарныя канвоі праваслаўныя жыхары Беластоцкага краю двойчы адпраўлялі ў раёны Заходняй Украіны і Закарпацце, якія летась таксама моцна пацярпелі ад паводкі.

Генадзь БАРБАРЫЧ.

19 траўня пачынаецца звальненне ў запас ваеннаслужачых тэрміновай службы, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны

З 19 траўня ў часцях і злучэннях Узброеных Сіл Беларусі пачалося звальненне ў запас ваеннаслужачых тэрміновай службы, якія выслужылі ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны — паўтара гады.

Гэтай вясной у запас будуць звольнены больш за 10 тысяч ваеннаслужачых; прыкладна столькі ж грамадзян плануецца прызваць на тэрміновую службу летам 1999 года. Прадугледжваецца, што першая партыя навабранцаў будзе адпраўлена ў войска напрыканцы чэрвеня.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

За праезд па тэрыторыі Белавежскай пушчы неабходна заплаціць

Зараз для таго, каб праехаць па тэрыторыі Белавежскай пушчы, трэба плаціць грошы. Рашэнне аб аплаце за праезд па тэрыторыі нацыянальных паркаў і запаведнікаў было прынята прэзідэнтам Беларусі і ўступіла ў сілу з 1 траўня гэтага года, аднак толькі нядаўна сталі вядомыя стаўкі за задавальненне палюбавацца прыгажосцю запаведных месцаў. Так, уладальнікі аўтамабіляў з беларускімі нумарамі за разавы праезд па тэрыторыі пушчы павінны заплаціць збор у памеры 0,2 мінімальнай зарплаты (200 тысяч рублёў); з аўтобусаў і грузавых аўтамабіляў бяруць 0,5 мінімалкі (500 тысяч): іншаземцам давядзецца плаціць значна больш — ад 5 да 10 долараў ЗША.

Ад уплаты збору вызваляюцца ветэраны, пенсіянеры, службовы аўтатранспарт і тыя, хто мае сельгасналзелы на тэрыторыі пушчы. За праезд па тэрыторыі нацыянальнага запаведніка павінны плаціць і тыя грамадзяне, якія на аўтамабілях наведваюць сваіх старых-бацькоў — гэта ў многіх выклікае незадаволенасць.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.
(БелаПАН)

В юридической консультации Михаила ПАСТУХОВА

На трудовые и социальные вопросы отвечает доктор юридических наук Виктор Кривой.

Требовать увольнения по сокращению штата нельзя!

Пишет Вам рабочий ПМК г.Лиды. Проживаю я в семейном общежитии 7,5 лет. Последние 6 лет администрация ПМК заставляет писать заявления об отпуске за свой счет, так как у нас нет работы. Уволиться обычно я не могу, так как тогда пропадет общежитие и очередь на квартиру. Есть ли какой-либо закон, на основании которого я смогу потребовать у администрации сокращения и таким образом перенести свою очередь на жилье из ПМК на городскую.

М.Кедык, г.Минск.

Закона, на основании которого работник мог бы требовать увольнения по сокращению численности или штата, нет. Ныне действующая статья 33 КЗоТ (в том числе пункт 1, предусматривающий возможность увольнения в связи с сокращением) регламентирует основания и порядок расторжения трудового договора по инициативе нанимателя, но не работника.

Здесь можно только "уговорить" нанимателя. По-хорошему, в этом деле Вам должен помочь профсоюз, если Вы состоите его членом.

Пособие по уходу за престарелыми

Два года присматриваю за престарелой женщиной, она живет одна, хотя у нее есть дети. Мне 53 года. В этом возрасте на работу уже не берут — а на учет как безработная не ставят. Ответьте, пожалуйста, можно ли это оформить по закону для трудового стажа, предусматривает ли государство оплату по уходу за престарелыми. Этот вопрос также интересует женщин на нашей улице, присматривающих за своими престарелыми матерями.

Л. Барсукова, г.Жодино.

Согласно сложившейся практике, оформленной, в частности, подпунктом 9.3 раздела 2 инструкции о порядке назначения и выплаты пособий, утвержденной 13.01.1992 г. Госкомтрудом, Минфином и Нацбанком, пособие по уходу за инвалидами I группы либо престарелыми гражданами, достигшими 80 лет (не моложе!), выплачивается лицам, являющимся трудоспособными, неработающими, и не получающими пенсию. Родственные связи роли здесь не играют. Важно то, кто фактически осуществляет уход.

Учитывая то, что Вы не работаете, нужны еще два условия, о которых не сказано в письме: неполучение Вами пенсии и то, что возраст старушки, за которой Вы ухаживаете, не менее 80 лет или она является инвалидом I группы. Если эти все условия соблюдены, можно обратиться в отдел социальной защиты по месту жительства для назначения пособия.

Размер пособия складывается на сегодня из 50% минимальной заработной платы, плюс компенсация 250 тысяч рублей, плюс индексация. Всего за апрель 1999 года основная сумма пособия составляет 500 тысяч рублей.

В соответствии со статьей 51 Закона "О пенсионном обеспечении" время ухода за вышеуказанными престарелыми гражданами засчитывается в стаж, дающий право на пенсию.

Колдоговор Закон не подменяет, а дополняет

В прошлом году меня уволили из местного Агросервиса по сокращению и одновременно назначили пенсию по возрасту в 59 лет по Закону "О занятости населения". При увольнении выплатили выходное пособие в связи с сокращением в размере трех среднемесячных заработков. Но в нашем коллективном договоре записано, что уходящим на пенсию выплачивается пособие в размере шести должностных окладов с надбавкой. Так мне выплатили не шесть окладов, а только три, мотивируя тем, что я уже получил три среднемесячных заработка в связи с сокращением. Права ли дирекция?

Синицкий В.П., г.Лельчицы.

Все здесь зависит от того, какая конкретно запись сделана в коллективном договоре. Если в нем не сказано, что пособие в связи с уходом на пенсию "поглощает" выходное пособие в связи с сокращением, то должны платить и то, и другое. Одно — согласно статье 36 КЗоТ, а другое — в соответствии с коллективным договором, который также имеет обязательную силу для нанимателя на основании закона "О коллективных договорах и соглашениях". КЗоТ и коллективный договор — это два отдельных нормативных акта, которые в таких случаях действуют самостоятельно, не подменяя, а дополняя друг друга.

Неправомерные действия нанимателя Вы можете обжаловать. В частности, в суд или местное подразделение Комитета по инспекции труда при Министерстве труда. Последнее, кстати, имеет право контролировать исполнение коллективного договора в соответствии со статьей 18 Закона "О коллективных договорах и соглашениях" и налагать штрафы на нанимателей и конкретных виновных должностных лиц за допущенные нарушения.

Пропорции в зарплате: и да, и нет

Наше предприятие государственное, но размер получаемой зарплаты у аппарата управления и ИТР в 5—6 раз выше чем у тех, кто непосредственно зарабатывает деньги предприятию. Есть ли пределы в зарплате чиновников предприятия?

Никитов М.

Пунктом 6 постановления Совета министров от 24.12.1998 г. №1972 "О дополнительных мерах по совершенствованию оплаты труда работников отраслей экономики" с 1 января 1999 г. установлен коэффициент соотношения средней заработной платы руководителей и средней заработной платы предприятия в целом не более 3,5.

Что же касается зарплаты других работников аппарата управления (руководителей, специалистов, служащих), то для них подобные пропорции в законодательстве специально не предусмотрены. Заработная плата выдается согласно штатному расписанию, которое в зависимости от определенных в статье 79 КЗоТ обстоятельств может основываться на республиканских тарифах оплаты труда (месячных тарифных ставках и должностных окладах, определяющих уровни оплаты труда для конкретных профессионально-квалификационных групп работников).

Сказанное, тем не менее, не мешает устанавливать пропорции в коллективных договорах и соглашениях на основании закона "О коллективных договорах и соглашениях", которые так же обязательны для нанимателей, как и законодательство.

Увольнение инвалида незаконно!

Прошу Вас разъяснить, правильно ли поступила администрация ОАО "Гомельобои", уволив моего сына с работы, не предупредив его, когда он находился в больнице.

8 февраля 1999 г. моему сыну, Юрию Владимировичу Савенку, городской МРЭК г.Гомеля установила вторую группу (нерабочую) инвалидности (общее заболевание), при этом в трудовую книжку комиссия вклеила справку о том, что он может работать только на дому.

В этот же день сын отвез трудовую книжку со справкой в отдел кадров завода. В ОК ему предложили принести недостающие документы (паспорт, в/б и свидетельство об образовании) для начисления пенсии. Сын ответил, что пока не сможет, так как 9 февраля ложится в больницу.

В больнице он находился по 9 марта т.г. Когда 10 марта он принес больничный лист в ОК, ему ответили, что он уволен с работы 8 февраля, в связи с уходом на пенсию.

З.Савенок, г.Гомель.

Согласно статье 31 КЗоТ, Вашего сына можно было уволить в связи с уходом на пенсию только при наличии его письменного заявления с просьбой уволить по собственному желанию в связи с уходом на пенсию. Если такого заявления не было (а судя по содержанию письма, дело обстоит именно так), то увольнение было незаконным.

По закону Вашего сына должны были уволить по пункту 2 статьи 33 КЗоТ в связи с несоответствием занимаемой должности вследствие состояния здоровья, причем не 8 или 9 февраля, а только по истечении не менее двух недель после уведомления профсоюза в соответствии со статьей 35 КЗоТ. А в силу того, что увольнение по указанному основанию не допускается в период временной нетрудоспособности (часть 3 статьи 33 КЗоТ), датой увольнения должно было быть (если своевременно было сделано вышеупомянутое уведомление) 10 марта — день выхода на работу после болезни. При этом полагается выходное пособие в размере не менее двухнедельного среднего заработка, согласно статье 36 КЗоТ.

Для восстановления нарушенных прав Вам надо обратиться в суд с иском о восстановлении на работе и взыскании заработной платы за время вынужденного прогула.

Криптограмма *"Выдающийся ученый и изобретатель"*

⊕	1	2	3	4	5	/	6	7	8	9	8	/	2	10	11	8	6	4	10
14	10	12	12	20	10	5	3	8	2	21	8	15	/	12	2	4	17	/	/
4	8	19	1	3	4	5	4	2	/	3	8	24	1	/	23	10	11	8	8
/	11	6	10	3	7	4	15	/	3	10	25	7	8	6	8	⊙	26	20	12
16	8	1															3	22	6
8	14	5															1	/	13
2	1	/															/	5	12
4	3	8															23	1	12
7	12	/															5	19	3
10	/	8															13	5	2
20	3	8															9	1	4
10	10	5															8	14	/
12	6	10															20	4	1
/	1	11															8	3	5
5	5	11															/	6	3
8	/	8															8	4	8
20	25	3															19	15	11
8	18	5															4	/	11
19	3	1															14	8	10
1	1	/															5	/	5
6	16	8															10	12	8
/	7	3	12	1	11	14	4	/	2	/	8	20	22	8	7	10	3	4	8
8.	10	24	13	3	12	4	9	4	7	20	/	20	10	8	7	1	23	19	"/
17	/	15	18	7	17	16	13	/	15	8	6	12	12	13	5	4	11	10	14



Уважаемый читатель!

В сегодняшнем номере газеты публикуется "Криптограмма" как новая рубрика наряду с широко известными "Кроссвордом", "Чайнвордом".

Криптограмма (греч. "криптос" — тайный, скрытый, "грамма" — письменный знак, черта, линия) — текст, выполненный одним из способов криптографии. Криптография (греч. "криптос"+"графо" — пишу) — тайнопись, способ тайного письма, понятного лишь посвященным лицам.

Криптография известна с древних времен. Ею пользовались Геродот, Плутарх, другие античные авторы. В восточнославянских рукописях она встречается с XII—XIII вв. Криптография широко использовалась для зашифровки военных, дипломатических, политических, торгово-финансовых, религиозных текстов различными способами.

Как в нашем варианте расшифровать криптограмму?

1. Расшифровку криптограммы следует производить по часовой стрелке. Начало расшифровки обозначено стрелкой.

2. Определить ключевые слова, значение которых изложено в условиях.

3. Каждую букву установленного слова написать над (под) соответствующей группой цифр, обозначенных в условиях.

4. Заменить цифры на рисунке криптограммы соответствующими буквами — и текст расшифрован.

Слова текста на рисунке отделяются клеткой с диагональю, в клетку вписываются необходимые знаки препинания. Начало для расшифровки текста криптограммы может обозначаться различными знаками.

Если новая рубрика будет одобрена читателем, криптограммы будут посвящены важнейшим событиям, выдающимся деятелям прошлого и настоящего Беларуси. Криптограммы будут выполнены на белорусском и русском языках.

Желаем успехов!

I. Первый генерал, особый министр, командовавший выделенной в особый корпус артиллерией Великого княжества Литовского (согласно реформам 1632—1638 гг.) — **1, 14, 5, 1, 20, 4, 2, 8, 16.**

II. Воины инженерных подразделений, входивших в состав выделенной в особый корпус артиллерии ВКЛ в XVII в. — **12, 1, 24, 17, 5, 18.**

III. Город, где во времена ВКЛ была создана (1540-е гг.) первая мастерская по отливке бронзовых и медных орудий — **2, 8, 11, 26, 7, 4.**

IV. Княжеский род ВКЛ, превративший свой замок в крепость, создавший собственную людвизарню (*Людвизарня — мастерская по отливке и художественной обработке орудий, колоколов и др.*), могучий арсенал — **5, 1, 23, 19, 8, 2, 8, 11, 11, 18.**

V. Герб, который ставили на орудиях корпуса артиллерии ВКЛ в XVII в. — **24, 4, 9, 4, 7, 22.**

VI. Четырехтонные орудия, отлитые в Вильно в XVI в. для замков ВКЛ — **7, 4, 3, 21, 11, 1, 7, 9, 8.**

VII. Отрасль техники, связанная с производством и применением огневых составов и снаряжаемых ими изделий (например, фейерверков) — **24, 8, 5, 4, 3, 10, 25, 7, 8, 6, 1.**

VIII. Название орудия из знаменитой серии орудий, отлитых в Несвиже в 1597—1603 гг. и ставших наилучшим образцом людвизарского искусства Европы — **24, 4, 24, 13, 9, 1, 15.**

IX. Летательный аппарат, движущийся под действием реактивной силы, возникающей при отбросе массы сгорающего топлива (рабочего тела) — **5, 1, 6, 10, 3, 1.**

X. Неподвижная часть горизонтального оперения летательного аппарата, служащая для обеспечения продольной устойчивости в полете — **12, 3, 1, 14, 8, 11, 8, 19, 1, 3, 4, 5.**

Составил Александр ЖДАНОВСКИЙ.

Минск.

Ответы на кроссворд, опубликованный в №85

По горизонтали: 1.Таракан. 5.Абак. 8.Плач. 11.Кубышка. 15.Езда. 16.Укор. 18.Рука. 19.Лелек. 20.Амир. 21.Доход. 22.Руссо. 23.Лакуна. 26.Обер. 28.Морена. 31."Пассат". 34.Кукуруза. 36.Анкета. 39.Оцелот. 42.Томат. 45.Пустомеля. 46.Янычар. 48.Горнило. 49.Мат. 50."Амо". 51.Киоскер. 53.Акопян. 56.Куропатка. 59.Палас. 62.Ералаш. 64.Калька. 67.Путаница. 70.Ватсон. 74.Африка. 77.Анис. 78.Зайсан. 81.Чугун. 82.Аршин. 83.Лимб. 84.Гарем. 85.Блат. 86.Сага. 87.Абаж. 88.Ротонда. 89.Сари. 90.Муха. 91.Арлекин.

По вертикали: 1.Тулуп. 2.Рельс. 3.Кукла. 4.Некк. 5.Адан. 6.Бамако. 7.Курок. 8.Проруха. 9.Аромат. 10.Чудо. 11.Кафе. 12.Баран. 13.Шоссе. 14.Айова. 17.Одер. 24.Атом. 25.Удел. 27.Бусы. 29.Ром. 30.НАТО. 32. Акулина. 33.Сытость. 35.Утята. 37.Контакт. 38.Толокно. 40.Цедра. 41.Лямка. 43.Осока. 44.Агора. 47.Ранец. 52.Епаф. 54.Кутаиси. 55.Пони. 57.Улей. 58.Ошва. 60.Луи. 61.Спарта. 63.Размах. 64.Кучер. 65.Легат. 66.Канун. 68.Анна. 69.Ислам. 71.Ангел. 72.Строк. 73.Неман. 75.Рыба. 76.Каас. 79."Абба". 80.Сажа.

Праваахоўнымі органамі вядзецца пошук злачынцаў, забіўшых у Мінску супрацоўніка міліцыі

Праваахоўныя органы краіны вядуць пошук злачынцаў, забіўшых 15 траўня ў Мінску супрацоўніка міліцыі. У гэты дзень два міліцыянеры прыбылі на спрацаваную сігналізацыю ў адной з кватэр дома па вуліцы Няміга, 8. Пры спробе пранікнуць у кватэру адзін з іх быў забіты выстралам з пісталета ў галаву (той, хто страляў, знаходзіўся ў кватэры), другі, пад пагрозай зброі, укладзены на падлогу. Злачынцы, якіх па наяўнай інфармацыі было трое, забраўшы ў міліцыянераў аўтамат і пісталет, уцяклі.

Як паведамілі у пракуратуры Мінска, па гэтым факце ўзбуджана крымінальная справа па артыкуле 189 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь — замах на жыццё супрацоўніка міліцыі. У прэс-цэнтры МУС Беларусі, паведамілі, што загінуўшы 37-гадовы прапаршчык міліцыі Аляксандр Жыдзік служыў міліцыянерам-кінолагам Цэнтральнага раённага аддзела аховы г. Мінска. У органах унутраных спраў — са снежня 1982 года. На ўтрыманні загінуўшага знаходзілася жонка і чацвёра дзяцей.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

"Тэатр псіхічнай неўраўнаважанасці" Іллі Сіна прадставіў сваю новую працу — "Лінчаванне"

Вечарам 17 траўня "Тэатр псіхічнай неўраўнаважанасці" Іллі Сіна прадставіў мінчанам сваю новую працу "Лінчаванне". Перад захадам сонца гледачы — у асноўным студэнты мінскіх ВНУ — сабраліся на прыпыначным пункце тралейбуса "Зялёны Луг-3" і пад кіраўніцтвам блазана накіраваліся да берага Цнянскага водасховішча, размешчанага на паўночна-усходняй ускраіне сталіцы.

Раптоўна на дарозе з'явіліся старажытныя рыцары ў бліскучых даспехах, якія размаўлялі на незразумелай мове. Яны з лаянкай накінуліся на маладога чалавека і сталі яго "збіваць", нягледзячы на просьбы аб літасці. Адзін з удзельнікаў акцыі са словамі: "Я не дазволю зневажаць чалавека!" кінуўся на рыцараў і спрабаваў спыніць "лінчаванне", аднак і сам быў "адолены". Паказ завяршыўся лодачнай прагулкай, мірным чаяпіццем і шахматнай партыяй паміж правадыром рыцараў і іх нядаўняй "ахвярай". Удзельнікам прадставілася магчымасць не толькі назіраць і суперажываць за ходам дзеяння, але і паспрабаваць стаць яго ўдзельнікам.

Паводле слоў вядомага беларускага паэта Зміцера Вішнева, скандальная творчасць Іллі Сіна з цікавасцю прымаюць літаратары і мастакі, акцёры і мастацтвазнаўцы, бо яна з'яўляецца яркім і актуальным элементам сучаснага літаратурнага жыцця. Дарэчы, у бліжэйшыя дні па запрашэнні грамадскай арганізацыі "Еўрапейскі эксперымент", штаб-кватэра якой знаходзіцца ў Брусэлі, Ілля Сін адправіцца ў Страсбург для ўдзелу ў семінары маладых літаратараў, музыкантаў і мастакоў.

Марат ГАРАВЫ, БелаПАН.

Хочаце — верце, хочаце — не верце...

Будучы тыдзень — зоркі прадказваюць...

Астрапсіхалагічны прагноз з 21 па 28 мая

Першая палова тыдня будзе спрыяльнай для завяршэння спраў, прыняцця канчатковых рашэнняў.

Выхадныя запатрабуюць стрыманасці ў пачуццях і памяркоўнасці ў адзнаках. На будучым тыдні нядрэнна было б аднавіць старыя сувязі. Новыя знаёмствы, хутчэй за ўсё, будуць аднаразовыя. Найбольш напружанымі днямі, па ўсёй верагоднасці, стануць 25 і 28 мая.

АВЕН. У сярэдзіне тыдня ўспомніце аб узвышаным каханні. 26 мая на вашым гарызонце нечакана можа з'явіцца забытая каханая ці каханы. Могуць узнікнуць праблемы новых знаёмстваў і пашырэння ўжо існуючых сувязяў, умення правільна скарыстоўваць мову і аперыраваць інфармацыяй. У пачатку гэтага тыдня вы здолееце паспяхова зрабіць пакупкі і ўкласці грошы. Магчыма, для гэтага запатрабуецца крыху рызыкнуць. У другой палове тыдня залішняя прынцыповасць здольная справакаваць непаразуменні ў зносінах.

ЦЯЛЕЦ. Пытанні матэрыяльнага росквіту зоймуць вас на наступным тыдні. У панядзелак і аўторак асабістыя справы запатрабуюць дыпламатыі. Бліжэй да выхадных спатрэбяцца вашы актыўныя дзеянні для вырашэння шэрагу хатніх праблем.

Калі вы вырашылі ўзрадаваць сябе новымі рэчамі, паспяшайцеся. Рабіце пакупкі ў чацвер ці пятніцу і не звяртайце ўвагі на іх кошт. Маральнае задавальненне ад новай рэчы вам забяспечана.

БЛІЗНЯТЫ. Надыходзячы тыдзень будзе звязаны з павышанай увагай да ўласнага самаадчування, узмоцненым клопатам аб знешнім выглядзе і жыццёвых сілах. У першай палове тыдня вы будзеце загружаны працай, прычым некаторыя справы прыйдзецца рабіць спачатку. Пастарайцеся ў гэтых занятках не дапусціць банальных плётак і дробных інтрыжак. Прыгледзьцеся да свайго спадарожніка жыцця: ці не з'явілася ў яго жыцці новае каханне?

РАК. У прадстаячым цыкле актыўнасці вам прыйдзецца стаць даследчыкам уласных глыбінь і разабрацца ў некаторых дагэтуль неўсведамляемых матывах сваіх учынкаў. У пачатку тыдня вы здолееце паспяхова спланаваць недалёкае будучае і атрымаць ад сяброў каштоўную інфармацыю. У другой яго палове жаданне пабыць у адзіноце не павінна зрабіцца перашкодай для кантактаў з акружаючымі.

ЛЕЎ. Доўгатэрміновыя планы і праекты, жыццёвыя перспектывы і адносіны з сябрамі прыцягнуць значную частку вашай увагі. У пачатку тыдня вы здолееце праявіць сябе добрым арганізатарам, што, несумненна, адлюструецца на вашай рэпутацыі і папулярнасці сярод блізкіх. У другой палове тыдня вы будзеце ў стане даволі ўдала ажыццявіць многае з задуманага. Калі, вядома, пажадаеце пераступіць тую мяжу, за якой словы ператвараюцца ў дзеянні.

ДЗЕВА. У пачатку тыдня поспех будзе падпільноўваць вас у любых занятках, спрыяючых пашырэнню кругагляду і павышэнню культурнага ўзроўню. Нямала часу прыйдзецца прысвяціць працы. Асаблівае натхненне вас чакае ў сераду. Калі ў гэты ж час вас запросяць у госці, абавязкова дайце згоду: гэта вам прынясе добры настрой. У другой палове тыдня ўдачу можа прынесці прафесійная дзейнасць. Матэрыяльны бок жыцця ў гэты перыяд будзе хваляваць вас менш за ўсё. Дзеці парадуюць вас нечаканым сюрпрызам.

ШАЛІ. Займіцеся падтрыманнем фізічнай формы. Час, праведзены ў трэнажорнай зале, прынясуць вынік ужо напрыканцы будучага тыдня. У пачатку тыдня вы, верагодна, здолееце ўдала разабрацца з наяўнымі даўгамі ці абавязацельствамі, а ў другой яго палове вам прыйдзецца папрацаваць над тымі сваімі перакананнямі, што перашкаджаюць спакойна жыць. А дапамогуць вам у гэтым сябры.

СКАРПІЁН. У вас ёсць шанц праявіць сябе ва ўсім сваім харастве. Жанчыны будуць асабліва сексуальна прывабнымі, а мужчыны будуць заваёўваць сэрцы слабога полу. Верагодна, лёгкі флірт перарасце ў сапраўднае пачуццё, і тады — трымайцеся.

Вецер зменаў кране розныя галіны вашага жыцця. Ад таго, як вы ўспрымеце гэтыя змяненні, будзе залежаць паспяховасць альбо няўдаласць будучых планаў і задум.

СТРАЛЕЦ. У пачатку тыдня вы здолееце з поспехам адстаяць уласныя інтарэсы і з зайздросным дыпламатызмам вырашыць шэраг спрэчных сітуацый. У другой палове тыдня, хутчэй за ўсё, вы будзеце здольнымі сёе-тое бязбольна пераўтварыць у сваім атачэнні, калі праявіце гнуткасць і акуратнасць. Магчыма, большую частку вашай увагі і сіл зоймуць пытанні прафесійнай дзейнасці і павышэння ўзроўню майстэрства.

КАЗЯРОГ. Надыходзячы тыдзень будзе звязаны з прапрацоўкай партнёрскіх адносін, вырашэннем усялякіх спрэчных пытанняў і ўменнем весці дыялогі. На пачатку тыдня вы здолееце паспяхова завяршыць раней распачатыя справы ў прафесійнай сферы. Магчыма, для гэтага ў другой палове тыдня вам прыйдзецца пабываць у вялікай камандзіроўцы, а таксама перагледзець некаторыя свае погляды адносна кахання. У пачатку тыдня пажадана зменшыць свой запал у рамантычных прыгодах і ўдзел у рызыкоўных справах, якія паступова стануць губляць сваю вастрыню.

ВАДАЛЕЙ. Перыяд жыцця, што мае быць, — гэта дзелавыя сустрэчы і перагаворы. Які вынік яны прынясуць, будзе залежаць перш-наперш ад вас. Вы можаце разлічваць на дапамогу сяброў, нават тых, якіх даўно ўжо не бачылі. У гэты ж час вы здолееце амаль ювелірна ўладкаваць магчымыя рознагалоссі са сваімі хатнімі. Звярніце ўвагу на сваё здароўе. У пачатку тыдня могуць абвастрыцца хранічныя хваробы.

РЫБЫ. Магчыма, вы закахаецеся ў чарговы раз. Вам будуць адказваць узаемнасцю. Аднак усю другую палову наступнага тыдня вы будзеце завалены працай, якая запатрабуе шмат сіл і часу. Хутчэй за ўсё, вы паспяхова вырашыце розныя прафесійныя справы і гэта прынясе вам не толькі маральнае задавальненне, але і грашовы прыбытак. У пачатку тыдня не ўпусціце шанцы завязаць карысныя знаёмствы.

Падрыхтавала Ірына НОВІК.

Узбуджальнік дызентэрыі выяўлены ў Аршанскім раёне Віцебскай вобласці

У Аршанскім раёне Віцебскай вобласці спецыялістамі санітарна-эпідэміялагічнай службы выяўлены ўзбуджальнік дызентэрыі. Паводле звестак Рэспубліканскага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, за мінулыя выхадныя дні ў Оршы з дыягназам "дызентэрыя" было шпіталізавана 36 чалавек. Яшчэ каля 30 чалавек былі змешчаны ў стацыянарныя медыцынскія ўстановы Аршанскага раёна з аналагічным дыягназам. Цяперашнім часам медыцынскія службы вобласці прыступілі да правядзення комплексу супрацьэпідэміялагічных мерапрыемстваў.

Аляксандр ПАПОВІЧ.

Пятница, 21 мая

Белорусское телевидение

06.30 Доброе утро, Беларусь!
07.00 Новости.
07.10 Доброе утро, Беларусь!
08.15 Политические диалоги.
08.40 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
09.00 Новости.
09.10 ТВ — школе. Белорусская литература. 9-й класс. А.Дударев. "Вечер".
09.40 Мульфильмы.
10.05 Уроки Н.Новожиловой.
10.30 Усадьба. Программа для дачников.
11.00 Новости.
11.10 Новые имена.
11.20 "Ветер в спину". Телесериал (Канада).
12.05 Сделано в Беларуси. Уникальные операции белорусских медиков.
12.25 Бон тон. Тележурнал моды.
13.00 Новости.
13.15 А.П.Чехов. "Чайка". Спектакль Гомельского областного драматического театра. Часть 2-я.
14.25 "Голубка моя". Телеочерк об участнице хора ветеранов г.Барановичи Н.М.Красильниковой.
14.45 "Галерея". Док. фильм ("Белвидеоцентр").
15.00 Новости.
15.10 Сериал для детей. "Боишься ли ты темноты?" (Канада).
15.35 Судьба моя и надежда. Социальная реабилитация инвалидов.
16.00 Регион. Передача из Гомеля.
16.25 "Риск-версия". Телеигра.
17.00 Новости (с сурдопереводом).
17.15 "А музыка звучит..." Джазовые импровизации в исполнении С.Манукяна, Ю.Кузнецова, С.Ваапирова.
17.35 Наш край. "Беларусь в зеркале мемуаров". Рассказывает Адам Мальдис.
18.05 "Ветер в спину". Телесериал (Канада).
18.50 Новые имена.
19.00 Новости.
19.15 "Сегодня с вами..." Художественный руководитель Государственного ансамбля танца Республики Беларусь Валентин Дудкевич.
19.40 Международные спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь! В программе: "Разговор в прямом эфире", "Что делать?", рубрика "Зоовести".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Премьера телеэкрана. Худ. фильм режиссера В.Абдрашитова "Время танцора" (Россия).
00.45 Новости.
00.55 Криминальная хроника.
01.00 Белорусский хит-парад.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
08.15 "Во имя любви". Сериал.
09.15 Программа "Мы".
10.00 Роман Карцев в программе Эльдара Рязанова.
10.40 Смак.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Сказка "Принцесса-невеста".
16.00 "Во имя любви". Сериал.
17.15 Джентльмен-шоу.
17.45 Играй, гармонь любимая!
18.15 Здоровье.
18.45 Поле чудес.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Погода.
20.45 Худ. фильм "План убийства".
22.10 "Жизнь замечательных людей".
22.40 Тема недели.
23.00 Фантастический боевик "Темная планета".
00.40 Программа передач.

РОССИЯ

06.00 Доброе утро, Россия!
06.20 "У всех на устах".
06.45 Телеигра "Программа передач".
07.15 "Тысяча и один день".
08.15 "Дежурная часть".
08.45 "Товары — почтой".
09.10 Сериал "Миледи".
10.00, 16.00, 19.00, 23.25 Вести.
15.15 "Музыка, музыка...".
15.25 Сериал "Первые поцелуи".
16.30 Башня.
16.55 "Навстречу ТЭФИ".
17.10 "Гомеопатия и здоровье".
17.15 Драма "С вечера до полудня". 2-я серия.
18.30 Сериал "Да, господин министр".
19.40 Подробности.
19.50 "Аншлаг".
20.55 Музыкальный ринг — новое поколение.
22.35 Подиум д'арт.
23.10 "Дежурная часть".
23.55 "Магазин на диване".
00.10 Прогноз погоды.

КУЛЬТУРА

07.00 Программа передач.
07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.25 Новодевичий монастырь.
07.55 Скульптор Владимир Цигаль.
08.40 Консилиум.
09.05 О.Аросева... и другие.
10.05 Произведения Ф.Листа и Ф.Шуберта.
10.20 "Забытые имена".
10.50 Российский курьер.
11.40 После новостей...
12.00 "Образы титанов".
13.10 "Видеопоэзия".
13.45 "Кто там..."
14.10 А.Скрябин. "Поэма экстаза".
14.30 "Что нас волнует больше вина".
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 "Время музыки".
15.55 Фантазеры.
16.40 "Встречи на Пикрис-горе".
17.40 Страна Фестивалия.
18.05 Очевидное-невероятное. Век XXI.
18.35 "Бриллианты мирового балета".
19.15 Чудо-сказка.
19.50 Художник В.Мухин.
20.05 "Джаз. Тема с вариациями".
20.45 После новостей.
21.05 Фильм Д.У.Гриффита "Нетерпимость". Часть 1-я.
22.00 Д.Хворостовский в театре "Новая опера".
22.30 Осел и соловей.
23.20 Программа передач.

НТВ

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00 Сегодня утром.
06.10, 07.15 Спорт.
06.15, 07.20 Погода.
06.20 Градусник.
06.25, 07.45 Сегоднячко.
06.35 Мультфильм.
06.45 Карданный вал.
06.50 Впрок.
07.25 Криминал.
07.35 Большие деньги.
08.10 Сериал "Любовь и тайны Сансет Бич".
09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
09.15 Детектив "Мафия бессмертна".
10.45 Мультфильм.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает...
13.30 Сериал "Детектив Нэш Бриджес".
14.20 "Сегоднячко". Красная стрела.
15.25 Сериал "Государственная граница". Фильм 5-й. "Год сорок первый". 1-я серия.
16.40 Впрок.
16.55 Футбольный клуб.
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 Боевик "Проект "А". Фильм 2-й.
21.45 "Криминальная Россия".
22.15 Фильм ужасов "Хэллоуин-II".
00.00 Программа передач.

8-й канал

18.00 Программа Кеннета Коупленда.
18.30 Худ. фильм "Северная звезда".
20.30 Вечарніца.
20.45 Музыка на телеканале...
21.15 между прочим.
21.30 Худ. фильм "Адвокат дьявола".

ТВ-6

05.55, 12.10 День за днем.
07.45, 17.20, 23.15 Дорожный патруль.
08.00, 10.00, 12.00, 14.00, 17.00 ТСН-6.
08.10, 23.40 Те Кто.
08.25 СВ шоу.
08.50, 14.20 Телемагазин для минчан.
09.00 Сериал "Династия II. Семья Колби".
10.10 Наша музыка. Валерий Меладзе.
14.10 "Знак качества".
14.45 Сериал "Дикая Роза".
15.35 Сериал "Келли".
16.00 ДИСК-канал.
16.35 "В мире людей".
17.35 Сериал "Грейс в огне I".
18.00 "Шоу Бенни Хилла".
19.00 "Новости дня".
19.30 "Скандалы недели".
20.05 "ОБОЗ".
21.00 Боевик "Ловец солнца".
23.30 Шесть новостей дня.
23.55 "Радио-хит".
01.00 Окончание передач.

Калектыў рэдакцыі "Народная воля" шчыра спачувае супрацоўніцы газеты Ніне Андрэеўне СОЦІНАЙ з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці бацькі.

Адрас рэдакцыі:

220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.
E-mail : nv@irex.minsk.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ПП "Мэджык". Адрас: г. Мінск, вул. В. Харужай, 13. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: суботні — 61050 экз., у другія дні — 55000 экз. Заказ №698